# СВЕРЖАНСКАЯ ФАЯНСАВАЯ МАНУФАКТУРА РАДЗІВІЛАЎ

**Я. У. Макоўская**

*Беларускі дзяржаўны універсітэт, г. Мінск;*
Yana@tst.by;
*навук. кір. – І. Л. Грыбко*

Работа прысвечана малавядомаму аспекту айчыннай эканамічнай і культурнай гісторыі – асвятленню гісторыі заснавання і функцыянавання свержанскай фаянсавай мануфактуры, якая працавалі на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XVIII стагоддзя. Даследаванне спрабуе прасачыць гісторыю дзейнасці фарфурні, узнавіць яе месца ў гісторыі роду Радзівілаў, а таксама нашай краіны. У працы значная ўвага надаецца вырабам прадпрыемства, разглядаецца асартымент мануфактуры, а таксама спосабы рэалезацыі прадукцыі. Аўтар вылучае дэкаратыўныя адметнасці вырабаў свержанскай «фаянсавай фабрыкі», якія склаліся на тэрыторыі сучаснай Беларусі і быў распрацаваны мясцовымі майстрамі.

***Ключавыя словы***: фаянс; свержанская фаянсавая мануфактура; фарфурня; дэкор фаянсавых вырабаў; фаянсавы посуд; тэрыны; кафля.

XVIII стагоддзе – час росту папулярнасці вырабаў з фарфору. Гэта з’ява была абумоўлена тым, што да пачатку XVIII стагоддзя Кітай фактычна быў манапалістам у галіне вытворчасці фарфору, але сітуацыя змянілася, калі ў пачатку XVIII ст. таямніца вытворчасці фарфору была адкрыта еўрапейцамі. Утрымаць сакрэт у межах Прусіі не ўдалося і хутка па ўсёй Еўропе сталі адчыняцца мануфактуры па вытворчасці фарфору. Тэрыторыя Рэчы Паспалітай не стала выключэннем. Ініцыятарам вырабу на Беларусі новага віду керамічнага посуду – фаянсавага, які быў больш прыгожы і вытанчаны, былі буйныя магнацкія рады. Радзівілы мелі сродкі і на такую раскошу, таму ў 1742 годзе князь Міхал Радзівіл Рыбанька заснаваў фаянсавую мануфактуру [1, с. 60].

«Фарфурня» была заснавана ў мястэчку Свержань Навагрудскага павету (сучасная вёска Новы Свержань Стаўбцоўскага раёна). Граматна абранае месца для пабудовы прадпрыемства было ўдалым. Са старажытных часоў тутэйшыя тэрыторыі заклікалі да сябе гандляроў і рамеснікаў. Вялікія перспектывы адкрывала наяўнасць буйной ракі – Нёмана, якая была актыўным гандлёвым шляхам мясцовага значэння (шлях на Мінск) і звязвала нашы землі з горадам Крулявец (сучасны Калінінград). У ваколіцах паселішча былі выяўлены залежы прыродных выкапняў, неабходныя дзеля вытворчасці фарфора і фаянса (перш за ўсё вапна) [2, с. 54]. Хутчэй за ўсё гэтыя фактары адыгралі не апошнюю ролю падчас выбару Міхалам Казімірам Радзівілам месца для вытворчасці фаянсу.

У вытокаў заснавання Свержанскай мануфактуры стаялі вопытныя спецыялісты з іншай фаянсавай мануфактуры, якую маці Міхала Радзівіла Ганна заснавала раней (каля 1727 г.) у мястэчку Бялае (Бяла-Падляска, сучасная тэрыторыя Польшчы) [2, с. 55]. Такімі майстрамі былі практыкі-спецыялісты Мацей Кручкоўскі і Ян Крупуз. Таксама ў справе арганізацыі вытворчасці ім дапамагаў мясцовы ганчар Ян Граймовіч. Даследчыкі выказваюць абгрунтаванае меркаванне аб тым, што за мастацкае аздабленне фаянсавай прадукцыі адказваў прыдворны мастак Радзівілаў Ксаверый Гескі [3, с. 81].

Неабходна ўзгадаць, што тэхналогія вытворчасці фарфура і яго аздаблення была таямніцай, якую старанна ахоўвалі. Майстрам не дазвалялась дзяліцца прыёмамі вытворчасці не з адной жывой душой. Усе падданыя Міхала Радзівіла Рыбанькі пад прысягай паабяцалі, што ніколі і ні пры якіх абставінах не распавядуць асаблівасці фаянсавай вытворчасці.

Дакументы сведчаць, што Свержанская фаянсавая мануфактура была заснавана з пяці будынкаў. Тры асноўныя былі вялікімі і прызаначаліся для выканання галоўных работ. Астатнія два былі значна меншых памераў і прызначаліся для фармоўкі і сушкі гатовых вырабаў. З цягам часу колькасць будынкаў, якія належылі мануфактуры толькі павялічвалася. Так хутка тут з’явіліся спецыяльныя будынкі, дзе гатавалі паліву, плавілі волава, выраблялі кафлю (кафельня). З павелічэннем колькасці выпрабляемай прадукцыі былі пабудавана скарбцы – асобныя памяшканні, дзе захоўвалася гатовая прадукцыя. А ў 1745 г. быў пабудаваны «выставачны павільён» – памяшканне для пакупнікоў, дзе былі прадстаўлены ўзоры гатовай прадукцыі [4, с. 17].

Асартымент Свержанскай мануфактуры ўражвае даследчыкаў сваёй разнастайнасцю і ўнікальнасцю. Ён падзяляўся на чатыры групы: сталовы і кухонны посуд, дэкаратыўная кераміка, санітарна-гігіенічная кераміка, асобна вылучаецца выраб пячной кафлі [5].

Да сталовага і кухоннага посуду рэестры адносяць: талеркі трох стандартных памераў, міскі розных форм, паўміскі, сподачкі, «тэрыны», супніцы, сухарніцы, маслёнкі, цукарніцы, кубачкі і філіжанкі са сподкамі, ванначкі для лімона і лёду, куфлі з накрыўкамі і без, збанкі для кавы, малака і піва, імбрычкі, тронкі для нажоў, відэльцаў і лыжак, гаршчочкі, падносы. З усіх гэтых рэчаў па жаданні заказчыка камплектаваліся сталовыя сервізы, у якія магло ўваходзіць ад некалькіх да сотні рэчаў. Стандартны вялікі сервіз налічваў тры тузіны – 36 прадметаў.

У другую групу вырабаў – дэкаратыўная пластыка – уваходзіла начынне для касцёльнага ўжытку (сасуды, распяцці, скульптурныя

дэталі алтароў), фігуркі шляхціцаў, бюсты старажытных філосафаў і «айцоў касцёла», а таксама ліхтары, люлькі, садовая скульптура, вазы [5].

Санітарна-гігіенічную кераміку складалі міскі для ўмывання і галення, паласкальніцы, аптэкарскія «пушкі», начныя гаршчкі і г.д.

Выраблялі на свержанскай фарфурні і пячную кафлю. Як правіла, кафлю выраблялі адразу ж цэлымі пячнымі наборамі. У дакументах згадваюцца печы белага і вішнёвага колеру [5].

Вырабаў мануфактуры хапала не толькі для патрэб нясвіжскага двара, але і на масавы продаж іх праз крамы і індывідуальныя запыты, асабліва ў тых выпадках, калі заказчык жадаў мець унікальны сервіз ці непаўторны камплект посуду. Для збыту прадукцыі была заснавана крама, якая адчынілася пры мануфактуры ў першыя ж гады яе існавання. У 1751 г. князь Міхал забараніў продаж любога фаянсу акрамя свержанскага на сваіх землях. А ўжо ў пачатку 1750-ых князь адчыніў фаянсавыя крамы ў Міры, Нясвіжы і Карэлічах [3, с. 82].

Фаянс, які выраблялі на Свержанскай «фарфурні», меў свае асаблівасці. Галоўнай мастацкай асаблівасцю беларускага фарфору лічыцца яго знешняе аздабленне. Вырабы аздабляліся роспісам каляровымі фарбамі. Як правіла, асноўнымі элементамі кампазіцыі былі расліны і кветкі, галінкі, фрукты, дрэвы – раслінны арнамент, характэрны для ўсяго заходнееўрапейскага фаянсу XVIII ст. Папулярнымі выявамі былі птушкі (паўліны) [5]. М. М. Яніцкая сцвярджае, што фансавы посуд Свержанскай «фарфурні» размалёўваўся выключна ў стылі кітайскага фарфору. Кампазіцыя выглядала наступным чынам: уся паверхня пакрывалась геаметрычным (часцей за ўсё рамбічным) арнаментам, у сярэдзіне кожнага ромба размяшчаліся выявы галінак, кветак, фруктаў, птушак. Выкарыстанне ўсходніх матываў у аздабленні прадукцыі тлумачыцца не толькі тагачаснай модай, але і імкненнем захаваць такія ж статусныя пазіцыі, характэрныя для дарагога кітайскага фарфору за свержанскім фаянсам [2, с. 59].

З гэтай мэтай праводзілася і маркіроўка выпускаемай прадукцыі. Справа ў тым, што вырабы свержанскай фаянсавай мануфактуры абазначаліся літарай «S» (час ад часу літара «S» змяшчалась у вузкай рамцы сіняга колеру) – клеймом вытворца, што значна спрашчае працэс атрыбутацыі вырабаў. На жаль, далёка не ўсе вырабы свержанскай «фарфурні» пазначаліся такім спецыяльным знакам [3, с. 81].

З смерцю заснавальніка мануфактуры Міхала Радзівіла ў 1762 г. «фарфурня» прыйшла ў заняпад. Зараз ад «фарфурні» засталіся толькі вялікія камянні ад фундаментаў пабудоў [3, с. 83]. Але нават такі непрацяглы перыяд дзейнасці гэтага прадпрыемства пакінуў заўважны

адбітак як у развіцці новай для таго часу мануфактурнай вытворчасці, так і ў скарбніцы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі.

**Бібліяграфічныя спасылкі:**


1. *Ганецкая І., Здановіч Н., Трусаў А.* Вытокі беларускага фаянсу // Мастацтва Беларусі. 1988. № 5. С. 59–61.
2. *Галоўка С.* Новы брэнд для Беларусі // Беларуская думка. 2016. № 7. С. 54–61.
3. *Яніцкая М. М.* Свержанская мануфактура фаянсаў // Памяць : Стаўбц. р-н : Гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі / уклад. М. В. Міхно. Мн., 2004. С. 81–83.
4. *Ганецкая И. В.* Производство майолики и фаянса на Беларуси XII–XVIII вв. : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.06. Мн., 1993.
5. Свержанскі фаянсавы посуд [Электроны рэсурс]. URL: https://zorny-kut.livejournal.com/30568.html (дата обращения: 15.02.2019).